монні, сярэднім цячэнні Зах. Буга. Маюць круглую форму, дыяметр 6—20 м, вышынню 0,5—0,8 м. Большасць даследчыкаў лічыць іх помнікамі заходнебалцкіх (яцвяжскіх) плямён. Пахавальны абрад трупапалажэнне і трупаспаленне. Пры раскопках знойдзены розныя побытавыя рэчы, зброя і ўпрыгожанні. У К.к. 11—13 ст. трапляюцца рэчы балцкіх і славянскіх тыпаў, што сведчыць пра славянізацыю балцкіх плямён.

**КАМЕ́ННЫЯ ЛА́ВЫ**, вёска ў Шклоўскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 15 км на Пд ад г. Шклоў, 21 км ад Магілёва, 1 км ад чыг. ст. Лотва. 162 ж., 75 двароў (1997). Сярэдняя школа, клуб, б-ка. Брацкая магіла сав. воінаў.

**КАМЕ́ННЫЯ МАТЭРЫЯ́ЛЫ І КАНСТРУ́КЦЫІ**, *будаўнічыя матэрыялы* (вырабы) каменепадобнай будовы і зробленыя з іх канструкцыйныя элементы (*будаўнічыя канструкцыі*). Шырока выкарыстоўваюцца для ўзвядзення і аддзелкі жылых, грамадскіх і прамысл. будынкаў, пры буд-ве дарог, гідратэхн., інж. і інш. збудаванняў.

Каменныя матэрыялы бываюць прыродныя (атрымліваюць з гранітаў, базальтаў, пясчанікаў і інш. горных парод мех. апрацоўкай або без яе) і штучныя (вырабляюць з мінер. сыравіны). Асн. разнавіднасці прыродных матэрыялаў: *пясок* і *жвір* (атрымліваюць прасейваннем і прамыўкай рыхлых парод); *друз*, каменная крошка і мука, мінер. парашкі (атрымліваюць драбленнем і размолваннем горных парод); *бутавы камень*, шашка для брукавання (атрымліваюць выбуховым спосабам і расколваннем вапняку, пясчаніку і інш. асадкавых парод); пілаваныя камяні, блокі (атрымліваюць выпілоўваннем *камянерэзнымі машынамі* з лёгкіх горных парод); абліцовачныя камяні, пліты, брусчатка, бартавы камень, арх. фасонныя вырабы і дэталі (атрымліваюць распілоўваннем, расколваннем, шліфоўкай скальных парод у працэсе *каменеапрацоўкі*; гл. таксама *Абліцовачныя матэрыялы*). Штучныя каменныя матэрыялы атрымліваюць тэхнал. перапрацоўкай горных (пераважна асадкавых) парод ці адходаў прамысл. вытв-сці. Гэта *бетон, жалезабетон, цэгла, будаўнічая кераміка,* многія *вогнетрывалыя матэрыялы, гіпсавыя і гіпсабетонныя вырабы,* прадукты *каменнага ліцця, шкло* і шкляныя вырабы, *сіталы* і *шклосіталы, цеплаізаляцыйныя матэрыялы, будаўнічыя растворы* і інш. Каменныя матэрыялы выкарыстоўваюцца як *запаўняльнікі* пры вытв-сці асфальта- і цэментабетонаў і як сыравіна ў вытв-сці цэменту, вапны, гіпсу. Каменныя канструкцыі бываюць нясучыя і агараджальныя: *фундаменты, сцены, аркі, скляпенні, перакрыцці,* слупы, перамычкі, дымавыя трубы і інш. Яны даўгавечныя, вогнеўстойлівыя, архітэктурна выразныя, могуць вырабляцца з мясц. буд. матэрыялаў. Вядомыя са старажытнасці (гл. *Архітэктура*). Для муравання выкарыстоўваюць гліняную і сілікатную цэглу, керамічныя і бетонныя камяні і блокі (суцэльныя і пустацелыя; гл. *Бетонныя вырабы і канструкцыі*), камяні з вапняку, пясчаніку, туфу, ракушачніку, буйныя блокі са звычайнага (цяжкага), сілікатнага і лёгкага бетону (гл. *Буйнаблочныя канструкцыі*). Асн. недахопы каменных канструкцый — вял. маса і недастатковая трываласць на расцяжэнне і выгін, значная працаёмістасць *каменных работ.* Для павышэння трываласці муроўкі і змяншэння яе масы выкарыстоўваюць комплексныя (узмоцненыя жалезабетоннымі элементамі) і *армакаменныя канструкцыі.* *І.І.Леановіч.*

**КАМЕ́ННЫЯ МО́ГІЛЬНІКІ**, археалагічныя помнікі 11—17 ст., адметныя наяўнасцю каменных муровак над магіламі і каменных вымасткаў (да пач. 13 ст., знак пакланненя Перуну). Належаць яцвягам. Асн. колькасць К.м. знаходзіцца на тэр. Гродзенскай вобл. Звычайна налічваюць 60—80 пахаванняў, характэрны сямейны прынцып. Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў яме, трапляюцца трупаспаленні. З 16 ст. на камянях у галавах выбівалі крыжы, часам у спалучэнні з салярнымі знакамі.

**КАМЕ́ННЫЯ РАБО́ТЫ**, работы, якія выконваюць пры ўзвядзенні будынкаў і збудаванняў з *каменных матэрыялаў і канструкцый*; разнавіднасць *будаўнічых работ.* Уключаюць асн. (тэхнал.), кантрольна-вымяральныя і дапаможныя працэсы (аперацыі).

Асн. тэхнал. аперацыі: падача і раскладка цэглы (камянёў) і буд. раствораў; укладка, абколванне і абчэсванне цэглы (камянёў), устаноўка буйных блокаў у праектнае становішча; наданне буд. швам пэўнай формы. Кантрольна-вымяральныя: праверка гарызантальнасці радоў цэглы (камянёў), вертыкальнасці сцен, якасці пярэдняй паверхні; дапаможныя: загатоўка матэрыялаў, мацаванне і перастаноўка рыштаванняў, мантаж перамычак, панэлей перагародак, пліт перакрыццяў, балконаў і інш. У залежнасці ад матэрыялаў муроўка бывае: бутавая і бутабетонная, цагляная суцэльная і аблегчаная, драбнаблочная і муроўка з абліцоўкай (бутавая, цагляная або з бетонных, сілікатных і керамічных камянёў; гл. *Муроўка*). *І.І.Леановіч.*



Да арт. **Каменныя работы**. Элементы муравання і сістэмы перавязкі: 1 — вонкавая вярста, выкладзеная рубам; 2 — вонкавая вярста, выкладзеная старчаком; 3 — вертыкальнае папярочнае шво; 4 — вертыкальнае падоўжнае шво; 5 — гарызантальныя швы; 6 — забутоўка.

**КАМЕ́ННЫЯ РЭ́КІ**, лінейна выцягнутыя намнажэнні абломкаў горных парод, якія павольна рухаюцца ўніз па схілах пад уздзеяннем сілы цяжару, працэсаў выветрывання і саліфлюкцыі. Найб. характэрны для раёнаў з кантынентальным кліматам і пашырэннем сезонна- і шматгадовамёрзлых парод. Дасягаюць даўжыні некалькіх кіламетраў. Часта трапляюцца ва Усх. Сібіры, Забайкаллі, Саянах.

**КАМЕНСАЛІ́ЗМ** (ад позналац. commensalis сатрапезнік), сатрапезніцтва, форма *сімбіёзу*, пры якой адзін з партнёраў сістэмы (каменсал) ускладае на другога (гаспадара) рэгуляцыю сваіх адносін са знешнім асяроддзем, але не мае з ім фізіял. сувязей. Звычайна гэта ўзаемаадносіны паміж 2 відамі ці арганізмамі, калі адзін з іх корміцца за кошт другога і не прычыняе яму шкоды. Гл. таксама *Мутуалізм.*

**КА́МЕНСКАЕ ГАРАДЗІ́ШЧА**, пасяленне канца 5—3 ст. да н.э. каля г. Каменка-Дняпроўская і с. Вял. Знаменка Запарожскай вобл. (Украіна). Пл. каля 12 км$^2$. З боку стэпу было ўмацавана зем-



Інструменты для **каменных работ**: 1 — камбінаваная кельма; 2 — расшыўка; 3 — растворная лапата; 4 — адвес; 5 — малаток-кірачка; 6 — трамбоўка; 7 — бетаналом; 8 — грунтвага; 9 — шаблон для разметкі праёмаў.